УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
______________________Ю.П.Бондар
“____” _________________2012 г.

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-17 01 71 Рэжысура свят і відовішчаў
кваліфікацыя: рэжысёр свят і відовішчаў
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі, зацверджаным 03.11.2010 г. № 25-17/197

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы: Майсяйчук Святлана Барысаўна,
прафесар кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", к.п.н., дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

Навукова-метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Уводзіны*

Сучасныя тэорыі сацыякультурнай дзейнасці, а таксама іх практычная рэалізацыя патрабуюць новых падыходаў да навучання і прафесійнай работы рэжысёра.

Важнай складаючай гэтай работы з’яўляецца тэхналогія арганізацыі і правядзення свят і відовішчаў.

У працэсе навучання слухачы набываюць не толькі тэарэтычныя веды, але і практычныя ўменні і навыкі сцэнарна-рэжысёрскай дзейнасці, атрымліваюць уяўленне як аб агульных драматургічных паняццях (драматычнае дзеянне, ідэйна-тэматычная задума, фабула і сюжэт, тэмп і рытм), так і аб тым, што вызначае спецыфіку драматургіі культурна-адпачынкавых праграм, іх рэжысёрскае ўвасабленне (архітэктоніка сцэнарыя, нумар і эпізод, прыёмы мантажу, выразныя сродкі, прынцыпы і прыёмы рэжысуры).

Слухачы займаюцца сцэнарнай распрацоўкай і рэжысёрска-пастановачнай работай над выбранай формай культурна-адпачынкавай праграмы.

Усяго на вывучэнне дысцыпліны адведзена 52 гадзіны, з іх 30 гадзін аўдыторных (14 - лекцый, 16 - практычныя), 22 гадзіны - самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

### Раздзел I. Уводзіны ў асновы драматургіі

| № п/п | Назва тэмы | Усяго | Лекцыі | Практ. | СРС |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Паняцце “драматургія”, асноўныя віды | 1 | 1 | | |
| 2. | Драматургія тэатра, радыё і тэлебачання | 4 | 2 | | 2 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3. | Спецыфіка драматургіі святочна-відовішчных праграм | 4 | 1 | 1 | 2 |

**Раздзел II. Методыка стварэння сцэнарыя святочна-відовішчных праграм**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4. | Асноўныя этапы работы над сцэнарыем святочна-відовішчных праграм | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 5. | Мантажны метад арганізацыі сцэнарнага матэрыялу | 4 | 1 | 1 | 2 |
| 6. | Тэатралізаваныя формы святочна-відовішчных праграм і іх сцэнарная распрацоўка | 4 | 1 | 1 | 2 |
| 7. | Драматургія святочна-відовішчных праграм | 5 | 2 | 1 | 2 |

**Раздзел III. Рэжысёрскія асновы святочна-відовішчных праграм**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8. | Прынцыпы і прыёмы рэжысуры ў святочна-відовішчнай дзейнасці. Мантажны ліст і рэжысёрскі план | 2 | 1 | 1 | |
| 9. | Вядучы святочна-відовішчных праграм | 3 | | 1 | 2 |
| 10. | Характарыстыка выразных сродкаў святочна-відовішчных праграм | 1 | 1 | | |

**Раздзел IV. Сцэнарная распрацоўка святочна-відовішчных праграм**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 11. | Вызначэнне ідэйна-тэматычнай задумы адпачынкавай праграмы і яе сюжэтнага ходу | 4 | 1 | 1 | 2 |
| 12. | Распрацоўка кампазіцыйнай пабудовы групавога сцэнарыя, вызначэнне асноўных эпізодаў, напісанне сцэнарнага плана | 1 | | 1 | |
| 13. | Сцэнарная распрацоўка эпізодаў, пошук прыёмаў мантажу | 4 | 1 | 1 | 2 |
| 14. | Літаратурны запіс сцэнарыя святочна-відовішчнай праграмы | 1 | | 1 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел V. Рэжысёрска-пастановачная работа над святочна-відовішчнай праграмай**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 15. | Састаўленне рэжысёрскага плана і мантажнага ліста | 4 | 1 | 1 | 2 |
| 16. | Рэпетыцыйны перыяд | 3 | | 1 | 2 |
| 17. | Адкрыты паказ падрыхтаванай культурна-адпачынкавай праграмы і яе абмеркаванне | 2 | | 2 | |
| | **Усяго** | **52** | **14** | **16** | **22** |

## *ЗМЕСТ КУРСА*

## РАЗДЗЕЛ 1. УВОДЗІНЫ Ў АСНОВЫ ДРАМАТУРГІІ

### Тэма 1. Паняцце "драматургія", асноўныя віды

Паняцце "драматургія" ў шырокім і вузкім сэнсе слова. Агульныя рысы і спецыфічныя асаблівасці драматычных твораў. Драматургія адпачынкавых праграм як драматургія ў шырокім сэнсе слова. Бесперапыннае драматургічнае дзеянне як асноўны прадмет адлюстравання. Сінкрэтызм асноўных відаў драматургічных мастацтваў. Мастацкі вобраз як другая рэальнасць.

### Тэма 2. Драматургія тэатра, радыё і тэлебачання

Драма як сцэнічны матэрыял. Аўтарскае бачанне будучага спектакля. Сучасная беларуская драматургія і яе ўвасабленне ў тэатрах рэспублікі.

Спецыфіка радыёдраматургіі. Асаблівасці радыёвяшчання ў FM дыяпазоне РБ. Фармат вяшчання як яго змястоўны бок. Характарыстыка асноўных эфірных блокаў: інфармацыйны, музычны, рэкламны, гульнявы, аўтарскія праграмы, зносіны са слухачамі. Іх характарыстыка ў радыёэфіры. Схемы радыёвяшчання: музычна-інфармацыйнае і інфармацыйна-музычнае. Іх характэрныя асаблівасці. Дзі-джэй радыёстанцыі і яго прафесійныя якасці. Асаблівасці сцэнарнай работы над рэкламным ролікам.

Спецыфічныя асаблівасці тэлевізійнай драматургіі. Віды тэлевізійных перадач: навіны, аналітычныя, тэматычныя, тэлевізійныя фільмы, ток-шоу, гульнявыя шоу, спартыўныя праграмы, музычныя, забаўляльныя і інш. Кампазіцыйная пабудова праграмы перадач як вёрстка канала. Асоба вядучага на TV.

### Тэма 3. Спецыфіка драматургіі святочна-відовішчных праграм

Агульныя рысы драматургіі святочна-відовішчных праграм і іншых відаў драматургіі і адметныя асаблівасці. Драматургія адпачынкавых праграм як важная частка тэхналогіі сацыякультурнага працэсу. Сюжэтна-вобразная канцэпцыя тэатралізаванага дзеяння. Форма праграмы як адлюстраванне пункту гледжання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнарыста на праблему. Характарыстыка асноўных формаў культурна-адпачынкавых праграм.

Асноўныя каналы выкарыстання дакументальных і гістарычных твораў ці іх фрагментаў у сцэнарыі. “Факты жыцця” і “факты мастацтва”. Эмацыянальнае і інтэлектуальнае ўздзеянне на аўдыторыю як асноўная задача драматурга. Мастацкае мысленне як аснова сцэнарнай дзейнасці.

***Практычныя заняткі.*** Прагляд святочна-відовішчнай праграмы і яе аналіз з мэтай замацавання асноўнай драматургічнай тэрміналогіі (драматычнае дзеянне, задума, тэма, ідэя, сюжет і фабула, кампазіцыя, тэмп, рытм і іншыя), а таксама агульных драматургічных законаў, якія ўласцівыя ўсім відовішчным мастацтвам, а таксама спецыфікі драматургіі святочна-відовішчных праграм.

## РАЗДЗЕЛ II. МЕТОДЫКА СТВАРЭННЯ СЦЭНАРЫЯ СВЯТОЧНА ВІДОВІШЧНЫХ ПРАГРАМ

### Тэма 4. Асноўныя этапы работы над сцэнарыем святочна-відовішчных праграм

Характарыстыка паняцця “сцэнарый святочна-відовішчнай праграмы”. Сцэнарый як спосаб фіксацыі будучага драматычнага дзеяння. Аўтарская задума – аснова будучай святочна-відовішчнай праграмы. Тэма і ідэя: праблема абазначэння і падмена паняццяў. Звышзадача і ракурс як адлюстраванне аўтарскай задумы. Злучэнне літаратурнай і рэжысёрскай ліній у рабоце над задумай.

Характарыстыка паняццяў “сцэнарны план”, “літаратурны сцэнарый”, “мантажны ліст” у кантэксце асноўных этапаў работы над сцэнарыем. Вызначэнне канструктыўных элементаў як важнейшы этап творчай дзейнасці сцэнарыста. Азначэнне паняццяў “архітэктоніка”, “кампазіцыя”. Асноўныя законы кампазіцыі: цэласнасць, узаемасувязь і супадначаленасць частак цэламу, падначаленасць выразных сродкаў аўтарскай задуме. Нумар і эпізод як адзінкі сцэнічнай інфармацыі. Паняцце “бесперапыннае драматургічнае дзеянне” і ўмовы яго дасягнення.

Характарыстыка асноўных кампазіцыйных элементаў сцэнарыя: экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка і фінал. Псіхалагічныя функцыі экспазіцыі і завязкі і іх кампазіцыйнае значэнне. Падпарадкаванасць асноўнага развіцця дзеяння раскрыццю ідэйна-тэматычнай задумы і сэжэтнаму ходу. Кульмінацыя як вяршыня развіцця драматургічнага дзеяння і вышэйшы эмацыянальны пункт успрымання гледачом праграмы. Развязка і фінал і іх значэнне ў завяршэнні сюжэтнай лініі сцэнарыя. Спосабы актывізацыі аўдыторыі ў фінале праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 5. Мантажны метад арганізацыі сцэнарнага матэрыялу

Характарыстыка асноўных метадаў сцэнарнай работы: ілюстрацыя, тэатралізацыя і мантаж. Іх суадносіны і асноўныя функцыі. Мантаж як родавы метад у культурна-адпачынкавай дзейнасці, аснова дзейснасці праграмы. Мантаж як "думка мастака, якая выражана ў адборы і супастаўленні кускоў" (М.Ром). Мантаж як "неадлюстраваны змест".

Віды і прыёмы мантажу: кантрастнасць, паралелізм, лейтматыў, "імгненная смерць кадра" (кліп). Функцыі мантажу: раскрыццё ідэйна-тэматычнай задумы; наданне цэласнасці святочна-відовішчнай праграме, арганізацыя ўспрымання гледачом; тэмпарытм праграмы. Асацыятыўнасць як агульная ўласцівасць творчага мантажу.

## Тэма 6. Тэатралізаваныя формы святочна-відовішчных праграм і іх сцэнарная распрацоўка

Характарыстыка тэатралізаваных формаў адпачынкавых праграм: літаратурна-музычная кампазіцыя, тэматычны вечар, тэатралізаваны канцэрт, свята. Асаблівасці мантажу літаратурна-мастацкіх і музычных элементаў (нумароў) у літаратурна-музычнай кампазіцыі. Асноўныя патрабаванні да яе архітэктонікі: дынамічнасць пабудовы матэрыялу, прапарцыянальнасць у адборы і прымяненні літаратурнага і музычнага матэрыялу, адпаведнасць музыкі літаратурнаму тэксту і агульнай атмасферы праграмы, захоўванне тэмпарытму. Ул.Яхантаў як "кампазітар літаратурных тэкстаў".

Сцэнарый тэатралізаванага тэматычнага вечара і яго асаблівасці. Адрозненне тэматычнага вечара ад літаратурна-музычнай кампазіцыі. Віды тэматычных вечароў. Асаблівасці адбору "фактаў жыцця" і іх выкарыстанне ў сцэнарыях тэатралізаваных тэматычных вечароў.

Тэатралізаваны канцэрт як разнавіднасць масавага прадстаўлення. Гісторыя ўзнікнення і развіцця гэтай формы культурна-адпачынкавых праграм. Мантаж мастацка завершанага нумара як спецыфічная рыса яго драматургіі. І.М.Туманаў аб кампазіцыйнай пабудове тэатралізаванага канцэрта. Вядучы ў канцэрце.

Поліфункцыянальнасць тэатралізаванага свята. Спецыфічныя асаблівасці яго драматургіі. Характарыстыка сродкаў уздзеяння на аўдыторыю свята. Улік асаблівасцей пляцоўкі для правядзення свята пры яго сцэнарнай распрацоўцы.

Свята і відовішча. Сюжэтна-гульнявыя праграмы і святы.

***Практычныя заняткі.***: Аналіз сцэнарыя адной з тэатралізаваных форм святочна-відовішчных праграм з мэтай высвятлення асаблівасцей яе кампазіцыйнай структуры, прыёму мантажу, а таксама характарыстыкі выразных сродкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 7. Драматургія святочна-відовішчных праграм

Характарыстыка асноўных формаў святочна-відовішчных праграм: сюжэтна-гульнявыя праграмы, конкурсы, капуснікі, карнавалы і інш. Спалучэнне імправізацыі і дакладна прадуманых дзеянняў у відовішчна-гульнявых формах. Асаблівасці сцэнарнай распрацоўкі капусніка. Асноўныя кампазіцыйныя элементы і выразныя сродкі карнавалу. Вядучы гульнявых праграм. Метады актывізацыі аўдыторыі.

***Практычныя заняткі.***

1.Індывідуальная работа слухачоў па напісанні сцэнарных планаў відовішчных праграм і іх літаратурнае афармленне.
2.Калектыўны аналіз распрацаваных сцэнарных планаў.

## РАЗДЗЕЛ III. РЭЖЫСЁРСКІЯ АСНОВЫ СВЯТОЧНА-ВІДОВІШЧНЫХ ПРАГРАМ

### Тэма 8. Прынцыпы і прыёмы рэжысуры ў святочна-відовішчнай дзейнасці. Мантажны ліст і рэжысёрскі план

Рэжысура ў святочна-відовішчнай дзейнасці як арганізацыя відовішчнага боку адпачынкавай праграмы, яе спецыфічныя асаблівасці. Суадносіны рэжысёрскай і драматургічнай задум у культурна-адпачынкавай праграме. Характэрныя рысы рэжысёрскай задумы.

Прынцыпы рэжысуры святочна-відовішчных праграм. Агульнамастацкія, эстэтычныя законы відовішчных мастацтваў і іх узаемасувязь са сцэнічнымі законамі актывізацыі аўдыторыі. “Рэжысура аўдыторыі”. Сінтэтычнасць культурна-адпачынкавых праграм. Асаблівасці рэжысёрскай арганізацыі тэмпарытму адпачынкавай праграмы. Мізансцэна як пластычны малюнак прадстаўлення. Веданне прыёмаў рэжысуры як спосаб авалодання рамяством пастаноўшчыка. Характарыстыка асноўных прыёмаў: сцэнічная рэалізацыя метафары, наўмыснае раскрыццё фабулы, прыём паўтору, выкарыстанне экрана і шчытоў з загалоўкамі, перанос сцэнічнага дзеяння ў глядзельную залу і інш.

Мантажны ліст як рэжысёрская партытура. Графы мантажнага ліста.

***Практычныя заняткі.***

Аналіз рэжысёрска-пастановачнай задумы і сцэнічнага ўвасаблення святочна-відовішчных праграм, прагледжаных у час вучэбна-творчай практыкі. Студэнтам у працэсе іх абмеркавання прапануецца вызначыць звышзадачу праграмы; прыёмы рэжысуры, выкарыстаныя пастаноўшчыкам; арганізацыю тэмпарытму прадстаўленн; прасторавае рашэнне праграмы; даць характарыстыку мізансцэн і асаблівасцей сценаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 9. Вядучы святочна-відовішчных праграм

Роля вядучага ў адпачынкавай праграме як арганізатара пазасюжэтнай сувязі паміж эпізодамі. Вядучы як пазасюжэтны персанаж. Характарыстыка асноўных функцый вядучага і прыёмы іх рэалізацыі. Вядучы -- інфарматар. Вядучы -- каментатар. Вядучы -- правакатар.Вядучы -- арганізатар. Вядучы -- акцёр. Работа рэжысёра-пастаноўшчыка адпачынкавай праграмы з вядучым. Выкарыстанне прыёму імправізацыі ў рабоце вядучага. Тыпы імправізацыі. Характарыстыка прафесійных уменняў і навыкаў вядучага культурна-адпачынкавай праграмы.

***Практычныя заняткі.*** На занятках працягваецца знаёмства з прыёмамі рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм, стылістычнымі асаблівасцямі вядучых і іх акцёрскага выканання ў прагледжаных праграмах.

### Тэма 10. Характарыстыка выразных сродкаў святочна-відовішчных праграм

Механізмы ўздзеяння культурна-адпачынкавай праграмы на аўдыторыю. Месца і роля выразных сродкаў у змястоўным, інтэлектуальным і эмацыянальным уздзеянні адпачынкавай праграмы.

Характарыстыка выразных сродкаў культурна-адпачынкавых праграм: мастацкае слова і слова вядучага, музыка, кіно і відэаматэрыялы, харэаграфічныя і пластычныя кампазіцыі, свет і гук. Узаемадзеянне і суадносіны выразных сродкаў. Праблема адбору.

## РАЗДЗЕЛ IV. СЦЭНАРНАЯ РАСПРАЦОЎКА СВЯТОЧНА-ВІДОВІШЧНАЙ ПРАГРАМЫ

На ***практычных занятках*** слухачы працуюць над напісаннем сцэнарыя адной з форм святочна-відовішчных праграм ( па выбары групы ).

## РАЗДЗЕЛ V. РЭЖЫСЁРСКА-ПАСТАНОВАЧНАЯ РАБОТА НАД СВЯТОЧНА-ВІДОВІШЧНАЙ ПРАГРАМАЙ

***Практычныя заняткі*** прысвячаюцца адкрытаму паказу падрыхтаванай святочна-відовішчнай праграмы і яе абмеркаванню.

**На экзамен** слухач прадстаўляе сцэнарную распрацоўку святочна-відовішчнай праграмы і публічна яе абараняе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


1. Аль Д.Н. Основы драматургии.-- Л: Просвещение,1988.
2. Аникст А. Теория драмы от Аристотеля до Лессинга. --М.: Искусство, 1975.
3. Аристотель. Об искусстве поэзии.-- М.: Искусство, 1957.
4. Богомолов Ю.А. Курьеры муз.-- М.: Искусство, 1986.
5. Борев Ю. Эстетика.-- М.: Высшая школа, 1975.
6. Вершовский Э. Режиссура массовых клубных представлений: Уч.пособие.-- М.: Моск. .гос. ин-т культуры,1981.
7. Винничук Л. Люди, нравы, обычаи Древней Греции и Рима.-- М.: Высшая школа, 1988.
8. Воловик А.Ф., Воловик В.А. Педагогика досуга: Учебник.-- М.: Моск. гос. ун-т. культуры, 1998.
9. Волькенштейн В.М. Драматургия.-- М.: Наука, 1969.
10. Генкин Д.М., Конович А.А. Сценарное мастерство культпросветработника.-- М.: Высшая школа, 1984.
11. Ершов П.М. Режиссура как практическая психология (взаимодействие людей в жизни и на сцене).-- М.: Искусство, 1972.
12. Козинцев Г.М. Собр.соч.: В 5-ти т.-- Л.: Искусство, 1986.
13. Культурно-досуговая деятельность: Учеб./ Под ред. А.Д.Жаркова, В.М.Чижикова.-- М.: Моск. гос. ун-т. культуры, 1998.
14. Марков О.И. Сценарно-режиссерские основы художественно-педагогической деятельности клуба.-- М.: Просвещение, 1988.
15. Маршак М.И. Клубный сценарий.-- М.: Искусство, 1975.
16. Немирович-Данченко В.И. Рождение театра.-- М.: Искусство, 1989.
17. Основы системы Станиславского: Учеб.пособие /Авт.-сост. Н.В.Киселёва, В.А.Фролов.-- Ростов-на-Дону: Феникс,2000.
18. Ратнер Я.В. Эстетические проблемы зрелищных искусств.-- М.: Просвещение, 1980.
19. Розовский М. Режиссура зрелища.-- М.: Сов. Россия, 1973.
20. Тихомиров Д.В. Беседы о режиссуре театрализованных представлений.-- М.: Сов. Россия,1977.
21. Товстоногов Г.А. Зеркало сцены: Кн.1 и 2.-- Л.: Искусство, 1980.
22. Триадский В.А. Основы режиссуры театрализованных представлений. – М.: Сов.Россия, 1985.
23. Туманов И.М. Режиссура массового праздника и театрализованного концерта.-- Л.: Искусство, 1974.
24. Хализеев В. Драма как явление искусства.-- М.: Искусство , 1978.
25. Чечетин А.И. Основы драматургии театрализованных представлений: история и теория: Учеб. для студ. ин-тов культуры.-- М.: Просвещение, 1981.
26. Чечетин А.И. Искусство театрализованных представлений.-- М.: Сов.Россия, 1988.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

27. Чижиков В.М. Методическое обеспечение культурно-досуговой деятельности.-- М.: Высш.школа, 1991.
28. Шароев И.Г. Режиссура эстрады и массовых представлений: Учеб. для студ. высш. театр. учеб. завед-ий.-- М.: Просвещение, 1986.
29. Шпагин В.А. Основные этапы работы над сценарием.-- Куйбышев: Куйб. гос. ин-т культуры, 1970.
30. Эйзенштейн С.М. Избр. произв.: В 6-ти т. -- М.: Искусство, 1980.
31. Эльконин Д.Б. Психология игры.-- М.: Педагогика, 1987.
32. Эфрос А. Профессия: режиссер.-- М.: Искусство, 1979.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ